Бібліятэка часопіса *Маладосць*

Паэзія

# ...І надзея, і лёс, і ўспамін



БІБЛІЯТЭКА
ЧАСОПІСА
Маладосць

МІНСК

Выдавецтва
ЦК КП Беларусі
1988







**СЛАВАМІР АДАМОВІЧ**
**ЭДУАРД АКУЛІН**
**ЮЛЬЯНА БАРМУТА**
**ПАВЕЛ БУРДЫКА**
**ПАВЕЛ ДЗМІТРУК**
**ХВЕДАР КАШКУРЭВІЧ**
**ЮРЫЙ КІСЯЛЕЎСКІ**





# ...І НАДЗЕЯ, І ЛЁС, І ЎСПАМІН





© «Маладосць»
«Бібліятэка часопіса «Маладосць», 1988 г.
1(1)

## Ад рэдкалегіі часопіса «Маладосць»

Дарагі чытач! Ты трымаеш у руках першую кніжку з «Бібліятэкі часопіса «Маладосць». Гэта выданне народжана нашым днём: яно з'яўляецца ў час, калі ідуць рэвалюцыйныя перамены ў краіне, калі надзвычай патрабуецца працоўная, грамадзянская, духоўная актыўнасць нашых людзей, моладзі асабліва.

Як вядома, вялікую ролю ў жыцці, у справе гарманічнага выхавання чалавека мае літаратура. Беларускія пісьменнікі зрабілі і робяць нямала, каб адлюстраваць нашу гісторыю, наш нялёгкі рух наперад, нашу сучаснасць з яе складанымі праблемамі. Але ў рэспубліцы склалася такая сітуацыя, што друкавацца стала цяжэй — літаратура расце, з'яўляюцца новыя творы, а пры ранейшых магчымасцях надрукаваць іх складана. Многія творы пра нашага сучасніка чакалі і чакаюць па некальгадоў, каб трапіць на старонкі друку. Таму і наспела жыццёвая неабходнасць выдання «Бібліятэкі часопіса «Маладосць».

Вось яна ўжо выходзіць. Гэта — яркае сведчанне таго, што Камуністычная партыя і Савецкі ўрад праяўляюць вялікую ўвагу і клопат пра літаратуру і мастацтва, пра творчую моладзь.

Найпершая мэта гэтай «Бібліятэкі» — знаёміць нашага чытача з лепшымі творамі маладых паэтаў, празаікаў, драматургаў, публіцыстаў, крытыкаў і мастакоў, у якіх будзе адчувацца пульс нашага стваральнага часу, духоўны свет сучасніка, яго імкненне ўнесці свой уклад у справу перабудовы нашага жыцця.

Мяркуецца выпускаць 12 кніжак «Бібліятэкі» ў год — па адной кожны месяц. Памер кніжкі паэзіі — 2 умоўна-выдавецкія аркушы, крытыкі і публіцыстыкі — 4, прозы — 5 умоўна-выдавецкіх аркушаў.

Гэтая «Бібліятэка» будзе распаўсюджвацца па лініі «Саюздруку», а таксама на яе можна аформіць падпіску — індэкс 74821, «Бібліятэка часопіса «Маладосць». Перыядычнасць — 12 нумароў у год. Падпісная цана на 6 месяцаў 1 р. 70 к., на 12 месяцаў — 3 р. 40 к.

Першае слова — паэтам з таварыства маладых літаратараў пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі.





## *Славамір Адамовіч*

*нарадзіўся ў 1962 годзе на станцыі Унежма Анежскага раёна Архангельскай вобласці. Скончыў Свірскае СПТВ-17. Працаваў трактарыстам, служыў у ВМФ, працаваў на чыгунцы, на заводзе імя Кірава ў Мінску. Цяпер — студэнт філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Друкаваўся ў рэспубліканскай прэсе.*

◆

Не спяшай, мая рыжая векша,
На чужое плячо не спяшай.
Гэта ж я напаткаў цябе першы,
Гэта ж мой ты прагнала адчай.

Будзе шэрае веча гарланіць,
Меднагорлыя будуць крычаць:
Разлучыць і свабоды пазбавіць!
Хай на столь у вязніцы глядзяць.

Толькі ж ты, мая рыжая векша,
Не пужайся людской дурнаты.
Сціхне веча, насупіцца вечар,
І засвеціцца серп залаты.

Рог затрубіць, гукне акарына,
Хваля вольнасці грудзі спаўе.
Першы твой і апошні мужчына
Прад табой на калені ўпадзе.

◆

Нібы паляны ў сунічным россыпе,
Раптам — полымя! — вусны каханай.
Мала паветра... радасна... млосна,
Страшна адзіным быць, ёю
абраным.

Німбы — прэч! Маёй паляшучцы
Дзікі хмель галаву уквеціць.
Колькі трэба, дастану са Случы
Зор, што падаюць на дасвецці.

Німфы, дзе вам зраўняцца з тою,
Што за ўсіх вас службу нясе
І над маёй дурной галавою
Рукі стрэшкай складае ў сне.

## ЯДЛОВЫ КУСТ

Уігліцы тваёй захаваўся уздых чысціні.
Мне здаецца, апошні, так жаласна каня
крычыць.
Нехта ў матчынай хаце на захад акно
расчыніў,
Каб у промнях крывавых палёт кажаноў
прасачыць.

Чуеш стогны? То крушні ўлягаюцца спаць.
Вунь каменні наверсе варушацца, як шчанюкі.
І на вейцы ў звярыны аб літасці слёзы трымцяць.
І ад вільгаці мякнуць бараознаў груды-камлюкі.

Ты расцеш на зямлі, да якой прырастаю і я.
Ты алтар мой зялёны, прыстанак лятункаў і мар.



Ты, ды, можа, той дуб сярод купін, ды звон ручая,
І забыты ратаем, зарослы ваўчыцай папар.

◆

Паперадзе бязлюднай электрычкі
Кульгавы змрок ляціць у нікуды,
І падаюць спалоханыя знічкі
Ў рачныя ціхаплынныя брады.

Схаваліся ад непагадзі душы
Пад абарог, адзін на цэлы свет.
А свет злажыў хатуль і сцежкай рушыў,
Смакуючы сяголетні ранет.

Ягоны шлях кіруе у суквецце
Галактык чыстых, дзе няма хлусні
І дзе на кожнай роснае планеце
Травой жывуць шакалы і ласі.

◆

*Багацькаўка! Мая мілая і ўмесьце з тым пастылая Багацькаўка! Люблю я цябе з тваім садком, ляском... Люблю тваіх мілых, слаўных, вясёлых дзетак, тужлівых старычкоў і вясёлых пявуньняў-дзевак. Ненавіджу тваю гразь, непрытульнасць. Скарэй набрацца сілухны і пачаць варушыць камні...*

Максім Гарэцкі

Тамсама ўсё квітнее — вішня й бэз,
І гордыя Асверы крэсляць неба.
Там маладым аблокам не паспець
Ад воч людскіх схаваць запрэжку Феба.

Тамсама ўсё шархучая трава,
І шэры чмель, і пыл, і скрып атосы.
І ровар, нахілёны да слупа,
І я бягу, расхрыстаны і босы.

О вобразы крывіцкія! о свет
І любасць над усім без атачэння!
Як хутка ападае белы цвет
І як марудна спее плод праменны.

◆

Праз лета, праз дзён карагод мігатлівы
Імкне мая думка ў рабінавы край,
Дзе ў матчыных казках пастух быў
шчаслівы
І ў поле рупліва выходзіў ратай.

Дзе розлівень сонца — калоссем жытнёвым.
У мэндліках-бабках снапы, як дубы.
Жаночыя рукі сярпом адмысловым
Звычайнымі рухамі крояць гады.

Здаецца, каторы ўжо раз я прыходжу
Ў спавіты туманам зялёны куток,
Дзе гэтак, як калісь, праз цень-агароджу
Фліртуе з чаромхай язмін-хітрунок.

◆

Нешаляваная хата глядзіцца вугламі ў свет.
Ля хаты на лаўцы тата вітае вясковых кабет.
Паўкругам гародчык прыткнуўся, шчарбаты
парканчык сівы
І сцежка, дзе я спатыкнуўся
аб корань бярозы-журбы.



Нешаляваная хата, парэпаных бёрнаў прыбой.
Скрыпячая веснічак варта, іржавы у клямцы
прабой.
Мундэра ля студні пад бэзам і блёкату
уедлівы зірк,
На камені пліска-гарэза, над поплавам
кнігаўкі крык.

Нешаляваная хата, за ёю сцяжына ў прастор.
За ёю дзівосаў багата, за ёю усё навыбор.
А толькі з вясёлых гасцінцаў штурхае за
грэблю ўспамін,
Дзе я на згарэлым дзядзінцы з ядлоўцам
адзін на адзін.

## НЕКАЛЬКІ КРОКАЎ ПА СЦЕЖЦЫ МАЛЕНСТВА

Нясу з мястэчка спелыя антоны
Ў бабулінай вярэйцы аж да пят,
Мінаючы жытнёвыя загоны,
Ўсміхаючыся чыстым вокнам хат.

А побачкі уся краса зямная
У візэрунках сцежак і платоў.
Я пра жыццё людзей зусім не знаю,
Бо па сваім няшмат яшчэ прайшоў.

І ўжо на вечар хіліцца, а сонца
Цікуе за пярэплаты бароў.
Вось хутка падыду — і у ваконца
Скажу сваім: я тут і жыў-здароў!

Зайду у хату, рыпнуўшы дзвярыма,
І пачастую маму і сястру...

2 Зак. 903

Яшчэ не час ляцець мне з хаты ў вырай,
Яшчэ я з вамі, родныя, расту.

◆

Абляцела лісце, абляцела
Засмучоных вербаў і рабін.
Адбалела сэрца, адбалела:
Сустракаю восень сам-адзін.

Дык аб чым, каршуне, ў небе крэчаш?
І нашто твой розгалас лясам?
Абляцела лісце у цямрэчу,
І самотна стала верасам.

Не крычы, прашу я, ў небе смурым,
Не кружляй над болем душ-растрыг.
Хай жа боль закрые, як парсуну
Закрывае вечнасці уздых.

**ЖОРАЎ**

Сівая адзінота.
Нязмога узляцець.
Кругамі ля балота
уночы ходзіць Смерць.
А досвіткам асеннім,
як сцішыцца імжа,—
зноў крыламі успеніць
нябёсаў вір душа.

**ЛІС**

Пунсовы ветразь плыў па лесе...
Нібы святло свячы ў сутонні.



Пунсовы ветразь — ліс на снезе,
агонь блукаючы на волі.

Плыві, прыгожы, покуль вецер
тваіх слядоў не пакідае,
і абмінуць здалей дасвецце,
дзе лёс-ганчак цябе чакае.



## *Эдуард Акулін*

*нарадзіўся ў 1963 годзе ў вёсцы Вялікія Нямкі Веткаўскага раёна. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Працуе выкладчыкам роднай мовы і літаратуры ў вёсцы Дуброва Рэчыцкага раёна. Друкаваўся ў рэспубліканскай прэсе.*

### МАЙСТРА

Тут усё прапахла лесам:
пілы, гэблікі, сякера...
Пад касым крысом павеці —
дзеда летняя кватэра.

Куфар, вулей ці кубельца —
не адмовіць ён нікому.
У старых руках умельцы
праца йдзе па-маладому.

А сягоння, хоць і рана,
адпачыць надумаў трошкі...
Прытуліў шчаку рубанак
да асінавае дошкі.

### ЗОНА АДЧУЖЭННЯ

Зона адчужэння —
якая жахлівая назва.
Адчужэнне —
ад хаты, дзе змалку рос.
Адчужэнне.
З сабой не возьмеш
прысаду святла бяроз,



асвер у двары, буслянку
і трох буслянят у ёй...
Апошні адбітак ганку
абцас пакідае мой.
Паўнюткія вёдры ў сенцах.
Дакуль ім з вадой стаяць?!
Да краю — трывогай сэрца.
Ці здолееш ношку ўзняць?
Радзіма!
Слязу употай
змахну за цябе ў маленні...
Не стань для майго Народа
зонаю адчужэння.

### МАЙ

Той май быў шчодры на дарункі:
на цеплыню, і на каханне,
і на працяглацсць пацалункаў —
ад Мілавіцы да світання.
Яшчэ на смутак паланезны
і на гартанны голас твой...
На мяккі водар сініх бэзаў,
які цадзіўся у пакой.

### ЖАНЧЫНА

Па меры таго, як памалу
зглыбі яна йшла на мель,
я бачыў: ад футарала
вызвалялася віяланчэль.

А пляж быў пусты і дзікі...
О, як бы хацеў я стаць
у момант той раптам смыкам,
каб струны яе кранаць.

◆

Мая бабулька Волька
вяршыць жыццёвы стог.
Не няньчылася доля,
Быў літасцівы бог.

Разменены апошні
дзесятак на вяку.
Жыццё як гляк парожні,
што сніць аб малаку.

Ды што цяпер аб гэтым —
нанова не пражыць...
Без страху перад ветрам
лісток жыцця дрыжыць.

◆

Вучу беларускаму слову.
Павазе да продкаў вучу.
Кажу пра Скарыну і Цётку,
аб лёсе Купалы — маўчу.

Раўняю снягоў сувоі
з бабулі сівым радном.
Ды ўсё-ткі — адзін не воін.
Аднаму — жыццё адно.

Вучу беларускаму слову.
Ды ўмерці было б лягчэй,
чым знесці: «Мы вучым мову,
каб Вам зарабляць на хлеб...»



◆

Месячнай цёплай ноччу
Шляхам апошнім, Млечным,
ціха ў Сусвет пакрочу,
буду сабе свяціць...
Каб і адтуль, з вышыняў,
каб і адтуль, з далечы,
бачыць цябе, Радзіма,
і, як цяпер, любіць.

## ГІСТАРЫЧНЫ ЭЦЮД

Ад раптоўнага руху рук,
нібы чмель у вялізнай кветцы,
зварухнуўся у звоне гук
і на волю штомоцы рвецца.

А званар не шкадуе рук,
аж званіцы сцябло трасецца.
І гудзе, і не хоча гук
заставацца у меднай кветцы.

Вось чужынец ускінуў лук,
на стралу нанізаўшы сэрца...
Ды жыве, не змаўкае гук,
як надзея усім, хто б'ецца!

## КАЛОДЗЕЖ

А цэбар улюбіўся
у дно, дзе зорак ззянне.
Стары ланцуг хваліўся,
што ён мацней кахання.

Адзін пусціць не хоча,
другі на дно імкнецца...
Я веру, што аднойчы
стары ланцуг парвецца.

**МАДОННА**

Я твой партрэт пісаць баюся:
ты кожны момант — рух бясконцы.
Ад зайздрасці цьмянее сонца
перад мадоннай з Белай Русі.
Я твой партрэт пісаць баюся,
хоць кожны рух той п'ю вачыма...
Што мёртвыя мадонны Рыма
перад жывою з Беларусі?!

◆

Падзялілі шлюбныя фоткі.
Разабралі з паліцаў кнігі.
І два лёсы жыцця паводка
развяла, як увесну крыгі.

Мо змялела кахання рэчка,
мо заціхлі пачуццяў хвалі?
Ціхамірна, без сцэн і спрэчак
мы сям'ю напалам ламалі.

Раздзялілі пароўну крыўды
і збіраемся далей жыць...
Толькі сынавы смех, скажы мне,
як мы будзем на двух дзяліць?



**ФРАНЦІШАК СКАРЫНА**

Полацк поўны саборным звонам.
Душы поўніць нябесным страхам.
Ад Сафійкі плывуць іконы,
люд на неба глядзіць у жаху.

Хтось спяшаўся грахі замольваць,
хтось зграшыць напаслед крыху...
А ўгары на вачах паволі
сонца тухне на паўшляху.

Цэлы горад схіліў калені,
калі голас пачуўся Твой...
Ты з'явіўся у час зацьмення,
каб народ асвяціць сабой.

**СЛОВА ПАЎЛЮКА БАГРЫМА**

З сэрцам, скрухай наўспрах збалелым,
і душой, што спаліў агмень,
мой народ, пілігрым аслеплы,
што не выйдзе з начы на дзень.

Вецер торбай махае зрэбнай.
Ні маленнем, ні скаргай-словам
не папросіць сабе збавення:
рот нішчымны — аднялі мову.

Безгалосы, як свет магілаў,
цягне крыж на сабе пакутны.
Сэрца прысак раздуць у сілах
толькі горана ўздых магутны.

## СЛЯЗА
## ПА КАСТУСЮ КАЛІНОЎСКАМУ

Яна вылузвалася з павек,
пасля слігцела па небасхіле,
мо нейкі момант, мо цэлы век
ля плахі плакаў народ бяссільны.

Яна кацілася па свячы,
нібы жывіца па кронах сосен.
Яна шукала працяг начы —
знайшла у душах, што траур носяць.

Адкуль яна — у таго спытай,
хто кроў і сэрца аддаў дазвання
за люд аблудлы, за родны Край,
які з каленяў павек не ўстане.

## ФРАНЦІШКУ БАГУШЭВІЧУ

Якая за праўду плата,
ці можаш, Мацей, сказаць?
А хіба бывае праўда
у краі, дзе душы спяць?

Якая за волю плата,
ці можаш, Мацей, сказаць?
За волю крывёй адплата,
не шкода й жыцця аддаць.

Якая за мову плата,
ці можаш, Мацей, сказаць?
І воля у ёй, і праўда,
і нельга яе адняць!





# *Юльяна Бармута*

*нарадзілася ў 1971 годзе ў вёсцы Велікарыта Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыла сярэднюю школу № 4 у горадзе Навагрудку. Вершы друкаваліся ў часопісе «Маладосць».*

◆

Што нашу я ў руках?
        Скарб і праклён.
Што нашу я ў душы?
        Думак палон.
Што я ў сэрцы нашу?
        Песню і плач.
Але долю прашу: «Не перайнач!»

## ДРЭВЫ

Чорна-белыя гарады.
Пачарнелыя дрэвы з нуды.
Пабялелыя стрэхі з жуды:
Плачуць хмары снягамі салёнымі.
Чорна-белыя цені наскрозь.
Дзе твой сябра? А вораг — вось.
А планеты крыштальная вось
Надламана вятрамі шалёнымі.
Перакрэслена неба галінкамі голымі.
Дрэвы тонкія — рукі дзяцей
Працягнулі да неба і шэптамі кволымі
Просяць даць ім цяпла і хоць кроплю надзей.

Чорна-белыя гарады.
Праз асфальт прабіваюцца кроплі вады.
Пачарнелі, набраклі сівыя ільды,
Плача неба дажджынкамі першымі.
Чорна-белыя цені наскрозь.
І хутчэй закруцілася тонкая вось,
Надламаная, сіняя, родная вось.
Ці яе уратую я вершамі?

## ПАЎЛЮКУ БАГРЫМУ

Жыў чалавек маленькі на зямлі.
Вясновым сонцам мала быў сагрэты,
Затое цепліў зерне у раллі,
Затое ён нястомным рос паэтам.
Ён на сабе адну навуку зведаў:
Вяршкі — панам, халопам — камялі!
Ён вырастаў з прымусу і з трагедый
І быў ужо крылатым — на зямлі.

◆

Сухія кветкі, цішыня і боль.
Кладуцца зорна цені на падлогу.
Хвіліны роспачы бягуць — і дзякуй богу,
І будзе шчасце, але сёння — боль.
Я не кахаю. Ды які мастак
Ізноў мае вярэдзіць успаміны.
Быў буйны снег. Ды спеюць ручаіны.
Ідзе вясна. І ўжо шчыруе шпак.
Хай будзе дзень! Але пакуль што — змрок,
Кладуцца зорна цені на падлогу,
І ў задуменні я стаю падоўгу
Ля той слязы, што ты прыслаў здалёк.



## ЗЯЛЁНАЯ ЗОРКА

Зялёная зорка на небе ўзышла,
Зялёная зорка па небе блукала.
Кагосьці ўсю ноч тая зорка шукала,
Кагосьці яна не знайшла, не знайшла.
Трывожная зорка па небе плыла.
І промні халодныя скрозь рассыпала.
Зялёная зорка самотнай была.
Успыхнула раз — і ў бяздонне упала.

◆

Я яшчэ пастаю хоць хвіліну ля самай мяжы,
Азірацца не буду, і вы гэта знаеце самі.
Недамоўкі нібыта каменне ляжаць на душы,
Недапетыя песні чужымі звіняць галасамі.
Я не стану чакаць. Я не буду парады прасіць.
Я прайду праз усё, калі трэба — і ў смерці
па лёстцы.
І прадзецца дарогі нязведанай тонкая ніць,
І з даверам у твар мне глядзяць невядомыя
вёсны.

## ПАДЗЯКА

Хмурным снежаньскім днём мне сяброўка дала
патрымаць
Ёй і мне не вядомыя Караткевіча «Каласы».
Я наўмысля адкрыла том, і ён стаў для мяне
альма-матэр,
І цяпер нават чую я, як пяюць верасы.

Там, далёка у травах няскошаных,
Да Дняпра нахілілась вярба,

І па сцежках палынных няходжаных
Скача белае жарабя.

Я жыла б, як жыла, а той кнігі магла і не знаць,
І ад роднай зямлі адвярнуўся б мой твар.
Я і вершы пляла б, з рыфмаў гацячы гаць,
І на сумнай раллі узрасла б я адною з пачвар.

Дзякуй вам, «Каласы», за пякучы, за боль,
Што мне сэрца і душу апёк.
Па-над краем ліецца ціхуткі бом,
Белы скача ў траве стрыгунок.

## БАЛАДА ВЕРШНІКА

Я іду па зачыненых вуліцах,
Кляштароў аглядаю муры,
Міма час праскакаў, як лучнік
На белым гарачым кані.

Чую тупат далёкіх пагонь,
І пад вершнікам падае конь,
І жалезу даверана спрэчка
Аб гонары.

Толькі лязгае меч аб меч,
А галовы злятаюць з плеч,
Не паспеўшы ўсмешку стаіць
Годную.

І чырвоная сталь ад крыві,
Пераблытаны ходы сюжэтаў,
Па завулках Гародні крывых
Ходзяць здані святых і паэтаў...



◆

Аб чым не ведаю, аб тым не раскажу,
Я ля агню патухлага сяджу,
Мне не сагрэць ні сэрца, ні душу,
Што будзе далей, потым пагляджу.
Туман плыве, як пара і як дым...
Навошта быць на свеце маладым?
Навошта быць наіўным і святым,
Калі ўсё гэта страціцца затым?
Навошта траціць цела і душу?
На выпʼю, закушу і саграшу?
Так, я таксама не крывёй пішу,
Але за гэта літасць не прашу,
Аб чым не ведаю, аб тым не раскажу,
І попел мокры-мокры ад дажджу
Я на далонях грэю і сушу.



## *Павел Бурдыка*

*нарадзіўся ў 1958 годзе ў вёсцы Заборцы Докшыцкага раёна. Служыў у Савецкай Арміі. Працаваў рабочым. Скончыў філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна. Працуе ў рэдакцыі радыёвузла ў Наваполацку. Вершы друкаваліся ў рэспубліканскай прэсе.*

◆

Рыпіць паціху з сенам воз,
І пырхаюць самотна коні,
А зоркі падаюць з нябёс
Ў мае малечыя далоні.
Спрасоння птушка пракрычыць,
Туман у лозе варухнецца,
Дзядуля курыць і маўчыць —
Я лезу да яго пагрэцца.
Шчаку казыча мне кажух,
І зноў дурманяць голаў зёлкі.
Мы перад небам толькі ўдвух.
Пад намі — хісткія аблокі.
Ледзь бачныя плятуцца коні,
Туман усё шчыльней, шчыльней.
І хутка млечнае прадонне
Накрые з галавой мяне.

### ДОМА

Па кутках скразнякі гуляюць,
Здзіраюць шпалеры з валошкамі,
І ты чытаеш: ЖЫТА, ХАТА, РАДЗІМА.
Па кутках скразнякі гуляюць,
Здзіраюць старыя газеты



І шорсткім пэндзлем у шэры колер
Фарбуюць сцены.
Не завіруюць ужо раніцой
Абрыўкі сноў і знаёмыя пахі,
Што прыгадаліся толькі цяпер.
Уздрыгнеш, сустрэўшыся позіркам
З калісьці вясёлым клоунам,
Які сумна з кутка ўсміхаецца —
Гэта яго мы тады згубілі.
І цяжка назад азірнуцца,
Бо зноў, як раней, падасца,
Што нехта страшны і шэры
Праз шыбу глядзіць на цябе.

### ПРАДЧУВАННЕ

Змешваю фарбы, добрыя і злыя,
не знаходжу патрэбнай
і ў бяссіллі кідаю пэндзлі.
А словы, падслуханыя і народжаныя,
змешваюцца, танчэюць, хутка знікаюць.
І ў каторы раз камячу паперу.
Я магу толькі бачыць і чуць.
Але што я магу?
Чаму я, з абвостраным зрокам і слыхам,
нямею?
Магчыма, таму, што я — ўсяго толькі
маленькая зморшчынка на твары,
танюткі прожылак на зялёным лісце...
Але ж я чую!
Чую, як трымціць, напінаецца кожны лісток...
Вось зараз... абрынецца неба.
Спяшайся!
І зноўку вясёлкавыя мыльныя бурбалкі
павольна натыкаюцца на аголеныя
нервы і гулка лопаюцца.

## КРОПКА СКРЫЖАВАННЯ

Снег зацярушвае дарогу,
у канцы якой — маленькая постаць.
Мы рухаемся насустрач адзін аднаму.
Недзе там, глыбока, мае дзіцячыя малюнкі.

Адно высокія гурбы кідаюць халодны свой цень.
Я дзесьці ўжо бачыў гэтага хлопчыка,
перавязанага хусткай паўзверх кажушка.
На саначках у яго брыкецікі торфу.
Наблізіўшыся, ён разгублена азіраецца па баках,
глядзіць запытальна мне ў вочы:
— А дзе наша хата?
У яго бліскучых зрэнках адбіваюся я —
маленькі.
(Чаму такія знаёмыя вочы?)
А ён чакае адказу.
Збянтэжана кранаюся рукава:
— Давай разам, я дапамагу.
Хлопчык упарта тузае плечуком,
рыпяць палазы — крэсляць мае малюнкі.
Нікога наперадзе.
Снег...

## ПАКАРАННЕ

На пачатку дарогі — маленькая драўляная хата.
У канцы яе — цагляны шматпавярховік.
У маленькай жывуць мае бацькі.
У вялікім — мае дзеці.
Я сам — сын і бацька,
і ўсё маё жыццё —
шлях з пачатку ў канец
і з канца ў пачатак.



Дзвюма чорнымі стужкамі разразае ён
скошаныя лугі, стажарні з буслам,
падобнымі на кіламетражныя слупы.
Аднаногія, з сумам пазіраюць буслы
на мой грукаткі, у адно акно дом,
нібы спачуваюць:
— Пацярпі яшчэ, ужо хутка...
І скончыцца тваё нявольніцтва.

## ТРЫВОЖНЫ ПАЛЁТ ПТУШКІ

Ёсць нешта большае, чым проста снег, чым
проста дрэвы, чым проста аблокі.
Параненая птушка напружана крэсліць
чорную лінію між белым і шэрым,
раўналежна зямлі, раўналежна небу.
Кроплі крыві глыбока ўбіваюцца
ў снег, прарастаюць горкімі ягадамі.
Енчыць ужо ў палёце страла,
пушчаная вартаўніком.
Хвалюе шоргат снегу, пах салодкага соку
пад карою здранцвелых дрэў,
а там, далей — разарваны край небасхілу.
Хапіла б толькі крыві!
І тады, напатканая стралой,
яна каменем упадзе на мяжу.
Каменем застанецца.
Тады сыдзе снег.
Тады ажывуць дрэвы.
Тады адкрыецца неба.

◆

Куды б я ні памкнуўся,
незразумелая журлівая музыка
зноў вяртае мяне да мёртвай ракі.

Стаю знерухомеўшы.
Мокрай пысай сабака уткнуўся
у далонь і дрыжыць.
Расхінуліся ціха хмары,
і сярпок маладзіка высвеціў
мноства людскіх чарапоў,
белых ад чорнай вады,
а побач з кожнай — жоўты агеньчык.
Мабыць, адтуль гэтая музыка?
Наблізіўшыся, я разумею,
што гэта наўсяго толькі выпеннікі,
і, уздыхнуўшы з палёгкай,
перабіраюся па іх на другі бок.
Ды толькі сабака жалобна
скуголіць на тым беразе.
Ды толькі гараць
у вадзе зоркі,
нікуды не сплываюць.



## *Павел Дзмітрук*

*нарадзіўся ў 1963 годзе ў вёсцы Дукора Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці. Скончыў ГПТВ у Мінску. Працуе рабочым на заводзе халадзільнікаў у Мінску. Друкаваўся ў рэспубліканскай прэсе.*

◆

...Ён прыйшоў. Я не ведаю, хто ён,—
мо адзін з паганскіх багоў, пра якога
ні аднаму з людзей невядома ані.
Ён з'явіўся, і ўсё, што навокал, пачало
існаваць незалежна
ад таго, як лічыў я патрэбным.
Ён сказаў: «Ты жадаеш спасцігнуць Сутнасць?
Раздзялі свае вершы на вершы пра зло і дабро
паасобку
і на вершы, якія не зможаш пакласці ні ў адны,
ні ў другія.
Раздзялі і спалі. І ізноў напішы і спалі.
Так да часу, пакуль увесь агонь не...»
І усё. І ён знік. І усё, што навокал, пачало
існаваць,
мне падуладнае.
Я расклаў свае вершы на вершы пра зло і дабро.
Неймаверная праца: адрозніць адно ад другога,
нат у тым, што табою напісана ці сказана
іншым.
Тры вершы я не здолеў пакласці ні ў адны,
ні ў другія.
Верш каханай, верш маці і верш Радзіме.
Не здолеў, бо гэта не зло і не дабро,
а іншае, існуючае незалежна...

І тады я паклаў свае вершы ў агонь.
І убачыў, як зло і дабро перасталі быць
на паперы і перайшлі ў мяне.
Я пачуў плач каханай, і адчуў сум матулі,
і адчуў нешта яшчэ—і гэтаму я не знайшоў
наймення. І гэта было ад Радзімы.
Потым я напісаў вершы маці, каханай, Радзіме,
злу і дабру.
І спаліў іх. І ізноў напісаў і спаліў.
Паліць свае вершы ненашмат лягчэй, чым
адрозніць, дзе зло, дзе дабро ў тым, што
табой напісана.
Але — дзіва: агонь з кожным запаленым вершам
не мацнеў, а суцішваўся.
Не ірваўся угору, а знікаў, бы ў мяне
пераходзячы разам з тым, што згарала.
Назаўтра на стале
ляжаў адзін аркуш. Нічога на ім
не было напісана...
І маўчаў агонь.

## ТРЫ ВЕРШЫ
## КАСТУСЮ КАЛІНОЎСКАМУ

### 1

Краю мой нібы воз:
Нехта конь у ім, нехта вазніца.
Скарб на возе.
Вазніца
У чужую вязе застаронь.
Краю мой нібы воз,
Воз, што мусіць дашчэнту разбіцца
Не таму, што не так,
Не ў той бок кіруе вазніца,



А таму, што ані
Закілзаны не ўпарціцца конь.

### 2

Поўня над ноччу, як волі срэбра
Над чорнай доляй народа.
Ноч над зямлёю, нібыта зрэб'е
Зямлі.
На шрамах нязводных.
Шрамы зямлі —
То сканалых спіны
На шляхах
Часінаю змрочнай
Праз скон, праз жыццё
Да вяршыні.
Вяршыня —
Поўня над чорнаю ноччу.

### 3

Ані цемры ўваччу, ані страху,
А толькі нязгода,
Толькі ў жылах нязгода
Віруе бунтоўную кроў.
Кроў, якой я адчуў
Лебядзіную песню народа,
І пакуты яго, і збавенне яго, і любоў.
Я народжаны тут,
Ў гэтым краі і ў гэтым народзе,
Але дзе алтары,
Дзе багі,
Дзе святыні мае!..
Я як цэгліна ў подзе,
Дарэшты распаленым подзе,—

Толькі выткнецца — і
Чыгуны паляцяць аб яе.
І не цемра ў вачох,
І не страх
Прад жыццём і прад смерцю.
А як псячая зграя
Сашчэпіць мяне, як турма,
Раздзяруць маё цела,
То ўз'енчаць:
«А дзе ж яго сэрца?!»
Так, няма ўва мне сэрца.
Няма. Для сабакаў няма.
І не бачыць яго вам,
Не ў тыя зайшліся вароты.
І яго не змагчы вам —
Яно у мільёнах баліць,
Як баліць гэты край —
Лебядзіная песня народа.
Як баліць гэты край...
Як баліць ён...
О, як ён баліць!

◆

Цягнік крануўся.
Прагі залатой
туман вакзальны
Не утрымаў вагоны.
Апошні купал... едзем... Божа мой!
Я ўдзячны развітальнаму перону.
Прабачце, Прага,
Вашую красу
Я назаўсёды ў сэрцы пранясу,
і ўсё-ткі



Шэпт вулачак былінных
І пыл злачоны з колішніх парогаў
Мне не мілей балотаў жураўліных
І пылу на прасёлкавых дарогах.
І я — ніхто,
Ніхто без той краіны,
Што мне на шлях
Жарству і верас слала.
Халодны дождж
І прысак арабіны
Мяне чакаюць там —
ці ж гэта мала?

## БЯРОЗА

*Маці маёй*

Прытуліся ка мне
Паўзабытым суцішаным болем,
Хай душу закране
Журбы верасеёвае дым.
Прытуліся ка мне,—
Пагаворым, як сёстры, з табою
Аб чыёйсьці вясне
І аб лецейку нашым былым.

Пагаворым аб тым,
Як канае свяча на зыходзе,
Як зямельчыну стынь
Працінае карэнне да дна,
Як ва ўлонні тваім
Новых парасткаў рой карагодзіць
З неадрыўнай падзякай,—
Такой навучыцца б сынам.

◆

Хмызы калючыя
З роднай зямлі
Табе не пастануць кратамі.
І зблыткі сцяжынаў
У родных дубровах —
Не путы для ног тваіх.
І зоркі ў нябёсах
Над краем тваім —
Як продкаў вочы узнятыя,—
Што яны маюць сказаць табе?!
А ты зазірні ў іх.

◆

*Прысвячаю дзвінскаму ралі*

Мой край, дабра табе
Прашу ў людзей тваіх
Лясам, што нібы грабянцы вятровы,
Азёрам, што ў глыбінях тояць словы
Вякоў былых.
І стогн, і покліч іх.
І рэкам,
Тым, што срэбныя падковы віюць на шчасце,
Ворагу пад дых.
Мой край, табе
Любові і аховы
Ў людзей тваіх
Прашу.
Для іх саміх.



◆

*Уладзіміру Сымонавічу Караткевічу*

Я любоўю багаты,
любоўю да краю свайго,
Як багаты крыніцай, хто смагі агонь спаталяе,
Як вандроўнік сцяжынай, што ў сінюю далеч сягае
Праз нянавісць і любасць
усіх існых людзей і багоў.

Я любоўю багаты,
любоўю да мовы сваёй.
Як багаты на ласку, хто родныя дзверы адчыніць,
Як багатыя сонцам, адседзеўшы ноч пры лучыне
Пад сіберынай лютай
з праклятых народам краёў.

Я любоўю багаты
святой да народа свайго.
Як багаты народ мой той песняй, што шчэ
заспявае,
Як багаты світанак, над гэтым народжаны краем
Карагодаў, буслоў, курганоў, камянёў і стагоў.

Я любоўю багаты,
Любоўю.
Не чымсьці, не нечым.
Як багатыя духам прарочым сівыя галовы.

Я заможны любоўю, а ты
заблукаў у галечы...
Ты прыйдзі —
Я табе
Ахвярую багацця палову.

◆

Ціхмяныя,
Сцярожкія дарогі
Грымотны
Да сябе гукае шлях,
Дзе вечна
Да твайго ісці парога,
Вялікая і родная зямля.
Не пазычаць ісці,
А да адплаты.

...І не дайсці,
І не зайсціся ў хату.

## НЕЗАКОНЧАНАЕ ПРАРОЦТВА

...І вернешся,
Бо некалі пайшоў.
І крочыш зноў —
За гэтым ты й вярнуўся.
Бо ты малых сцяжынаў не крануўся,
Бо ты шляхоў вялікіх не знайшоў.
І крочыш зноў,
І адшукаеш схоў,
Дзе сэнс жыцця дарогі агарнулі,
Як дрэва сэрца ў гадавыя рулі...
Бязвыйсны лабірынт тваіх гадоў.
І не адзін раз вычварнае груддзе
Утне бездапаможнасці абразай.
Але ідзі...
— А як дайду, што будзе?
За гэтым што?

А ты дайдзі адразу...





## *Хведар Кашкурэвіч*

*нарадзіўся ў 1963 годзе ў Мінску. Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча. Зараз — студэнт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Служыў у Савецкай Арміі. З вершамі ў зборніку выступае ўпершыню.*

◆

У магільні фамільнай
спадкаемцы чарговага ўсмешка
не спаўзае
з ачарсцвелых вуснаў
толькі восені рэштка
ў паглядзе змутнелым
тае.

◆

Здранцвенне
у яву учэпленых пальцаў
штодзённа і марна
бо кожнаму — кара
наканаваная
і кожны — карай
сам кожнаму іншаму
змножаны
надзеі і мары
у шатах шарых і норах
кратовых
хаваюць сполах
а з вышыні з вяршыняў гмахаў
у цяжары хмараў і крэкце

птахаў
прарочыць рэха.

◆

Натапырылі дрэвы вілы
у раз'ятраным ярасці віры
ядраная хмелю вязь
гэтым шляхам праехаў князь
развярэджаны рой пчаліны
нібы вар апаліў успаміны
Радзівіла
ссушаны твар
у сутарэнні
сухая пастава
абуджаецца
нараджаецца ява
для цікаўных на продаж тавар

◆

Пачапіла ў натоўпе свой позірк
знявага
утароплена зеўрыць
паўзверх утрапення
дзе маўкліва ірвецца
бяссіллем спавітае
сэрца

◆

Ён імкнецца ў дарогу
у нішто
ён не мовіць нічога
нямы
немаўля



то — не ты
гэта — я
проста ў існасці —
пустка
толькі ў памяці —
яснасць
дзе віна
дзе нікога
дзе я
мур складаю
грувастка
з літар
а слова —
няма



## *Юрый Кісялеўскі*

*нарадзіўся ў 1961 годзе ў Гродна. Скончыў Гродзенскі медінстытут. Працуе ў Гродзенскім медінстытуце на кафедры біяхіміі. Вершы друкаваліся ў газеце «Літаратура і мастацтва» і ў часопісе «Маладосць».*

### РАЗВІТАЛЬНАЕ ПАВІТАННЕ

Жаўрук спяваў.
І яблыня цвіла.
Ты дачакаўся красавання траў!
Ужо не ў першы раз
Вясновага цяпла
Па-над зямлёю хваля праплыла —
І ты адвечны атрымаў адказ
На ўсе свае адвечныя пытанні.

І колькі ты яшчэ разоў
Паўторыш прагна заклінанне,
Каб ён прыходзіў зноў і зноў:
І цёплы подых веснавых вятроў,
І жаўрука бясконцы спеў,
І пацалунак паміж дрэў,
І яблыневы сад парою адцвітання!

І ты дасі сваю нямую згоду
На лепшую з усіх узнагароду:
Падняцца ў неба, павітаць сусвет,
А потым легчы на зямлю, бы яблыневы цвет,
І развітацца з ёю — назаўсёды.



### ПРОЦІБОРСТВА

Груган цыбаты,
Што каркае гучна
Пра скарацечнасць жыцця,
Прарочыць рашуча
Хуткі прыход небыцця
І абвяшчае нам немінучасць смерці,—
Груган пракляты
Пасяліўся ў маім сэрцы.

Сава сівая,
Сляпое стварэнне,
Што нам варожыць аб марнасці нашых імкненняў
І будзіць плачам глухую шыр,—
Сава старая
Шукае
Прытулку
У завулку
Маёй душы.

Слімак цынічны,
Які бярэ пад сумненне
І шэпт крынічны,
І зор мігценне
І ганьбіць прывычна
Літую непахіснасць маралі,
Што марна стваралі
Багі і людзі,—
Слімак нікчэмны бянтэжыць мае пачуцці.

Нячысцік-Змей,
Што адамкнуў мне, як маг-чарадзей,
Бяздомны калодзеж пазнання,
І той без усялякага спачування
І нават без лішняга роздуму

Закінуў мяне ў засценкі журбы
І нішчыць у цемры агеньчык слабы
Майго мізэрнага розуму.

Спрачаюся з імі аж да знямогі,
Хоць ведаю: не можа быць перамогі.
Няўжо ў гэтай спрэчцы, пустой і дарэмнай,
Што цягнецца часам аж да світання,
Хаваецца сэнс патаемны
Пазнання
І мэта майго існавання
На гэтай зялёнай планеце,
У гэтым цудоўным і жудасным свеце?

## ЗОРНЫ ДОЖДЖ

Аж да кружэння галавы
Грымелі маршы і парады,
І мужна маршал тылавы
Брывамі аддаваў загады.

Ён толькі сон перамагаў,
Не ведаў болю і трывогі
І мірным часам атрымаў
Славуты ордэн «Перамогі».

Хоць зорак з неба не хапаў
(Не тыя здольнасці, вядома!) —
Ён іншых зорак зажадаў
Пераканана і свядома.

Бесперапынны зоркапад
Звінеў над соннаю краінай
І абсыпаўся, нібы град,
У час чарговай гадавіны.



І зорканосцы сталі ў рад,
Глядзі і радуйся, сучаснік:
Вось — касманаўт, вось — казнакрад,
Вось — чынадрал, а вось — калгаснік.

Такой лавіны ўзнагарод
Яшчэ не бачыла краіна.
І ўжо не верыць наш народ
У подзвіг часты, штохвілінны.

І аддаецца мне ў вушах
(Не я прыдумаў то, паверце!):
«Не дзіва — цацкі на грудзях.
Святое золата — у сэрцы».

◆

Было спачатку слова?
Ды не, зусім не так.
Быў позірк выпадковы,
і быў міжвольны знак.

Прызнання прадчуванне,
няўлоўны бляск вачэй,
няроўнае дыханне,
гуллівы смех званчэй.

Было яшчэ здзіўленне,
няўрымслівы спалох,
тамленне, захапленне
і цішыня, дальбог...

Маўклівая размова,
бязгучны вуснаў рух...
Пашто нямое слова,
калі гаворыць дух?

## ВЕРШАВОДСТВА

У маім паэтычным гародзе
штосьці вершаў зямелька не родзіць...
Ці суглінак які занядбаны?
Ці ўзараў не занадта старанна?

Ці насенне пасеяў не тое?
Ці лянуюся пырскаць вадою?
Ці то гною падкінуць шкадую?
Ці ад птушак гарод не вартую?

Пагляджу — у суседа ў садочку
гэтых вершаў, што жаб у ставочку,
нібы зор на шчыце паднябесным
альбо блох на сабаку аблезлым!

Пагляджу — у другога за плотам
мо гектар пад яго агародам!
Ды і ў трэцяга — вершанашэсце...
Столькі іх, што калгасам не з'есці!

Што ж рабіць, падкажыце мне, людзі?
Колькі ж можна дарэмна марудзіць?
Можа, трэба мне рукі адсекчы?
Альбо кінуць гародчык
ды збегчы?

## ГАРОДНЯ

Сёння я паглядзеў на свой горад чужымі вачамі.
Колькі сонца і фарбаў у ім, колькі ласкі, цяпла!
Над натоўпам людскім, над узнятымі ўвысь
купаламі,
як прамень, непазбыўных вякоў чарада працякла.



Закранулі цябе сваім крыллем свінец і пажары,
ліхалецце, набат, гора, боль, немінучая
смерць...
А цяпер над табой, над тваёю акрыленай фарай —
толькі ў вечным блакіце вясноваму грому грымець.

Там, дзе біліся з ворагам гордыя дужыя продкі,
дзе жалезнай навале выносілі гнеўны прысуд,—
белы саван рамонкаў — бясконцы, пяшчотны,
дрыготкі,
а над ім матылькі, як бязгучны іскрысты салют.

Палюбіў гэты горад увесь, да апошняе рыскі.
І калі застаюся з Гародняй адзін на адзін —
аж трымціць маё сэрца ад сустрэчы з нязнаным
і блізкім,
з тым, што ўсё для мяне — і надзея, і лёс,
і ўспамін.

## КНІЖНІКІ

Гэтым кніжнікам часта дзіўлюся,
іх жыццю сярод пылу і кніг,
іх наіўнаму жалю і скрусе
па геройскіх падзеях былых.

Прагавіты, учэпісты позірк.
Зжоўклы том у дрыготкіх руках.
Стосы кніжак на бруднай падлозе.
Цыгарэта ў шчарбатых зубах.

Неахайны, нябрыты, нязграбны,
толькі здраджваюць вочы святло
думкі шчырай, крылатай, прывабнай,
што квітнее нягодам назло.



3

Сэрцам там, дзе за блізкай надзеяй
каравелы вядзе Магелан.
Або там, дзе на вулкі Пампеі
попел смерці шпурляе вулкан.

Сціплы схімнік надзвычай багаты:
песціць ён клапатліва, без страт,
нібы колас малыя зярняты,
сотні звонкіх і трапных цытат.

Але ж мне аніяк не пазбыцца
недарэчнага мо пачуцця:
ці ж далёкай Элады зарніцы
тых зырчэй, што ў акне зіхацяць?

Ці ж раскоша паўднёвай прыроды
і загадкі не нашых часоў
прыгажэй за цябе, краю родны,
за таемнасць тваіх курганоў?

І таму прамяняю без жалю
я дурманлівы кніжны нябыт
на азёрныя зябкія хвалі,
на бясконцыя зыбкія далі
і на неба празрысты блакіт.



## ЗМЕСТ


**Славамір АДАМОВІЧ**
*** Не спяшай, мая рыжая векша... . . . 5
*** Нібы паляны ў сунічным россыпе... . . . 6
Ядловы куст . . . 6
*** Папярэдзе бязлюднай электрычкі... . . . 7
*** Тамсама ўсё квітнее—вішня й бэз... . . . 7
***Праз лета, праз дзён карагод мігатлівы... . . . 8
*** Нешаляваная хата глядзіцца вугламі ў свет... . . . 8
Некалькі крокаў па сцежцы маленства . . . 9
*** Абляцела лісце, абляцела... . . . 10
Жораў . . . 10
Ліс . . . 10

**Эдуард АКУЛІН**
Майстра . . . 12
Зона адчужэння . . . 12
Май . . . 13
Жанчына . . . 13
***Мая бабулька Волька... . . . 14
*** Вучу беларускаму слову... . . . 14
*** Месячнай цёплай ноччу... . . . 15
Гістарычны эцюд . . . 15
Калодзеж . . . 15
Мадонна . . . 16
*** Падзялілі шлюбныя фоткі... . . . 16
Францішак Скарына . . . 17
Слова Паўлюка Багрыма . . . 17
Сляза па Кастусю Каліноўскаму . . . 18
Францішку Багушэвічу . . . 18

**Юльяна БАРМУТА**
*** Што нашу я ў руках?.. . . . 19
Дрэвы . . . 19
Паўлюку Багрыму . . . 20
*** Сухія кветкі, цішыня і боль... . . . 20
Зялёная зорка . . . 21
*** Я яшчэ пастаю хоць хвіліну ля самай мяжы . . . 21
Падзяка . . . 21
Балада вершніка . . . 22
*** Аб чым не ведаю, аб тым не раскажу.. . . . 23

**Павел БУРДЫКА**
*** Рыпіць паціху з сенам воз... . . . 24
Дома . . . 24
Прадчуванне . . . 25
Кропка скрыжавання . . . 26
Пакаранне . . . 26
Трывожны палёт птушкі . . . 27
*** Куды б я ні памкнуўся... . . . 27

**Павел ДЗМІТРУК**
*** ...Ён прыйшоў. Я не ведаю, хто ён... . . . 29
Тры вершы Кастусю Каліноўскаму . . . 30
*** Цягнік крануўся... . . . 32
Бяроза . . . 33
***Хмызы калючыя... . . . 34
*** Мой край, дабра табе... . . . 34
*** Я любоўю багаты... . . . 35

*** Ціхмяныя, сцярожкія дарогі... . . . . . . . . 36
Незаконччанае прароцтва . . . . . . . . . . 36

**Хведар КАШКУРЭВІЧ**
*** У магільні фамільнай... . . . . . . . . . . 37
*** Здранцвенне ў яву учэпленых пальцаў... . . . . 37
*** Натапырылі дрэвы вілы... . . . . . . . . . 38
*** Пачапіла ў натоўпе свой позірк... . . . . . . . 38
*** Ён імкнецца ў дарогу... . . . . . . . . . 38

**Юрый КІСЯЛЕЎСКІ**
Развітальнае павітанне . . . . . . . . . . . . 40
Проціборства . . . . . . . . . . . . . . 41
Зорны дождж . . . . . . . . . . . . . . 42
*** Было спачатку слова?.. . . . . . . . . . 43
Вершаводства . . . . . . . . . . . . . 44
Гароднля . . . . . . . . . . . . . . . 44
Кніжнікі . . . . . . . . . . . . . . . 45

...І НАДЗЕЯ, І ЛЕС, І ЎСПАМІН

Адказны за выпуск **А. Грачанікаў.**

Рэдактар **Я. Янішчыц.**
Мастак **А. Карповіч.**
Мастацкі рэдактар **В. Казлоў.**
Тэхнічны рэдактар **Я. Важнік.**
Карэктар **В. Башак.**

Адрас рэдакцыі: 220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79.

Здадзена ў набор 15.04.88. Падпісана да друку 25.05.88. АТ 09608. Фармат 70×100 1/32. Друк высокі. Умоўн. фарбаадб. 2,28. Умоўн. друк. арк. 1,94. Ул.-выд. арк. 1,78. Тыраж 5047 экз. Цана 25 кап. Зак. 903.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. 220041, Мінск, Ленінскі праспект, 79.

Цана 25 к. 74821

